Источник: "Настаўніцкая газета" - 2018-02-06

# 30 гадоў на ўзлёце

**2 лютага ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае 30-годдзю заснавання навукова-метадычнага часопіса "Роднае слова". Падзея, у якой прынялі ўдзел кіраўніцтва і супрацоўнікі НАН Беларусі, прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі, культуры і інфармацыі, сябры Саюза пісьменнікаў Беларусі, навукоўцы, кіраўнікі педагагічных СМІ, настаўнікі і аўтары выдання, прайшла ў межах рэалізацыі Комплекснага плана сумесных мерапрыемстваў Нацыянальнай акадэміі навук і Беларускай Праваслаўнай Царквы.**

У сваім уступным слове галоўны рэдактар часопіса "Роднае слова" Зоя Падлiпская нагадала прысутным пра яго гісторыю — пачынаючы са студзеня 1988 года, калі часопіс пачаў выходзіць як штомесячнае навуковае і метадычнае выданне для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры пад назвай "Беларуская мова і літаратура ў школе", і да сённяшняга часу. Светлым словам яна ўспомніла незабыўнага Міхася Мікалаевіча Шывыркіна, які шчыраваў на чале часопіса першыя 18 гадоў.

За тры дзесяцігоддзі выданне змясціла больш як 10 тысяч матэрыялаў, а толькі за апошнія тры гады рэдакцыяй падрыхтавана 1019 публікацый, з іх 145 артыкулаў вучоных са ступенню доктара навук, 462 — кандыдата навук, 157 матэрыялаў сталі апрабацыяй кандыдацкіх (129) і доктарскіх (28) дысертацый. "Сёння "Роднае слова" — гэта ўжо прызнаны навуковы і метадычны часопіс, які добра вядомы не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі, — адзначыла Зоя Падлiпская. — Сярод нашых аўтараў — вядомыя вучоныя, а таксама аспiранты і дактаранты Беларусі, Украіны, Расіі, Літвы, Латвіі, Славакіі, Японіі, Казахстана, Кітая. І менавіта дзякуючы нашым шаноўным аўтарам наш часопіс уваходзіць у Пералік навуковых выданняў Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь, мае даволі высокі статус у навуковым свеце".

Па словах Зоі Падлiпскай, часопіс "Роднае слова", нягледзячы на ўсе аб'ектыўныя фінансава-эканамічныя сувязі, працягвае пашыраць сваю прысутнасць у адукацыйна-культурнай сферы. Гэта, акрамя асноўнай дзейнасці па забеспячэнні беларускага настаўніцтва навукова-метадычнай дапамогай у выглядзе друкаваных матэрыялаў на старонках выдання, актыўная работа з творчай адоранай моладдзю (за кошт конкурсаў, якія арганізоўвае часопіс), шматлікія кнігавыдавецкія ініцыятывы і інш. Не так даўно чытачы атрымалі магчымасць падпісвацца на электронную версію выдання.

У сваю чаргу старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Гусакоў падкрэсліў, што сёння, як і раней, унікальнасць часопіса "Роднае слова" ў тым, што ён комплексна прэзентуе найлепшыя дасягненні айчынных і замежных вучоных у галіне філалогіі, мастацтвазнаўства, педагогікі і культуралогіі. "Рэдакцыя часопіса шмат робіць для фарміравання нацыянальнай навуковай эліты, — адзначыў Уладзімір Рыгоравіч. — "Роднае слова" папулярызуе найлепшыя літаратуразнаўчыя, мовазнаўчыя і культуралагічныя здабыткі сучасных вучоных, распаўсюджвае духоўныя каштоўнасці беларускага народа. Гэта жыватворная крыніца, якая далучае маладое пакаленне да беларускай і сусветнай духоўна-культурнай спадчыны". Старшыня прэзідыума НАН Беларусі таксама заўважыў, што невыпадкова юбілей часопіса адзначаецца ў сценах акадэміі навук. Па словах Уладзіміра Гусакова, за апошнія гады айчыннымі навукоўцамі, акадэмічнымі інстытутамі шмат зроблена па навуковым забеспячэнні развіцця беларускай мовы. Тым не менш вучоным-гуманітарыям, на яго думку, неабходна ўзмацніць супрацоўніцтва з часопісам.

З нагоды юбілею выдання з рук Уладзіміра Гусакова Зоя Падлiпская атрымала ўзнагароду Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Словы прывітання ў адрас часопіса таксама выказаў член Сінадальнага аддзела рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі Беларускай Праваслаўнай Царквы епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Веньямін, які звярнуў увагу на тое, што на працягу ўсяго існавання выдання ва ўсіх яго справах існуе духоўная накіраванасць. І гэта натуральна, бо слова непарыўна звязана з духоўнасцю чалавека і праз слова чалавек атрымлівае магчымасць звяртацца да Бога, а ад Бога атрымліваць прасвятленне. У гэтай сувязі ўладыка Веньямін працытаваў словы беларускага першадрукара Францыска Скарыны, вынесеныя на вокладку студзеньскага нумара часопіса: "Любіце і шануце, як святыню, роднае слова, з якім вас літасцівы Бог на свет пусціў".

Уладыка Веньямін уручыў галоўнаму рэдактару выдання Ганаровую грамату Сінадальнага аддзела рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі БПЦ.

Падзякі і граматы ў сувязі з юбілеем З.І.Падлiпская і іншыя супрацоўнікі выдання атрымалі таксама ад Міністэрства адукацыі ў асобе яго прэс-сакратара Людмілы Юльянаўны Высоцкай, Міністэрства інфармацыі ў асобе начальніка інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Таццяны Мікалаеўны Хмель, Міністэрства культуры ў асобе галоўнага спецыяліста ўпраўлення культуры і народнай творчасці Сяргея Уладзіміравіча Бацяна.

Са словамі віншавання ў адрас часопіса выступілі таксама дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі акадэмік А.І.Лакотка, доктар філалагічных навук акадэмік А.А.Лукашанец, дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі І.Л.Капылоў, дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі І.В.Саверчанка, доктар філалагічных навук прафесар кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі БДУ В.І.Іўчанкаў, доктар філалагічных навук, прафесар, галоўны рэдактар часопіса "Беларуская мова і літаратура" А.І.Бельскі, даследчык, пісьменнік, член-карэспандэнт Міжнароднай генеалагічнай акадэміі, лаўрэат спецпрэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва А.В.Статкевіч-Чабаганаў, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы БДУ М.Р.Прыгодзіч, першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі А.А.Стэльмах і інш.

Як сказаў І.Л.Капылоў, часопісу "Роднае слова" ўдаецца на працягу 30 гадоў заставацца на ўзлёце, пацвярджаць высокі ўзровень навукова-метадычнага выдання, быць інавацыйнай пляцоўкай для скіраваных на пошук і даследчую дзейнасць настаўнікаў роднай мовы і літаратуры, утрымліваць аптымальны баланс навукі, прыктыкі і інтарэсаў чытача.

**Мікола ЧЭМЕР.**
gilevitch@ng-press.by